Т.Я.Старасценка

# ПРЫМЕТНІК

Варыянт 1

Тэст А

**А1. Устанавіце адпаведнасць паміж прыметнікам і прыметай, выражанай ім. Адзначце нумар правільнага адказу.**

А. Чырвоны — 1) знешняя якасць чалавека
Б. Школьны — 2) прымета паводле прызначэння
В. Стройны — 3) прымета паводле часу
Г. Ранішні — 4) прымета паводле прыналежнасці
Д. Дзядулеў — 5) якасць, што ўспрымаецца органамі пачуццяў

□А1Б4В3Г5Д2
□А4Б5В1Г2Д3
□А2Б1В3Г4Д5
□А5Б2В1Г3Д2
□А3Б4В2Г3Д5

**А2. Адзначце субстантываваныя прыметнікі.**

□1) Вечназялёны;
□2) злакавыя;
□3) далёкаўсходні;
□4) паляўнічы;
□5) пяцігадовы.

**А3. Адзначце словазлучэнні з якаснымі прыметнікамі.**

□1) Цёмнаваты колер;
□2) друкарскі цэх;
□3) Васілёў конь;
□4) курчавы хлопчык;
□5) жытняя мука.

**А4. Адзначце словазлучэнні з адноснымі прыметнікамі.**

□1) Коласава слова;
□2) універсітэцкая канферэнцыя;
□3) густы бор;
□4) новы палетак;
□5) леташні адпачынак.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**А5. Адзначце словазлучэнні з прыналежнымі прыметнікамі.**

□1) Купалава паэма;
□2) лясныя ягады;
□3) Колеў дзённік;
□4) родная зямля;
□5) чырвоныя ягады.

**А6. Адзначце словазлучэнні з адноснымі прыметнікамі, ужытымі ў значэнні якасных.**

□1) Тэатральны сезон;
□2) залатое лісце;
□3) стальны трос;
□4) каменны будынак;
□5) жалезная воля.

**А7. Устанавіце адпаведнасць паміж прыметнікам у словазлучэнні і яго разрадам. Адзначце нумар правільнага адказу.**

| | |
|---|---|
| А. Матчына хусцінка | 1) якасны |
| Б. Вясновая раніца | 2) адносны |
| В. Багдановічаўскі стыль | 3) прыналежны |
| Г. Паэтычная назва | 4) адносна-прыналежны |
| Д. Родныя краявіды | 5) адносна-якасны |

□А4Б5В1Г3Д2
□А1Б4В5Г2Д3
□А2Б3В4Г1Д5
□А5Б1В3Г4Д2
□А3Б2В4Г5Д1

**А8. Адзначце якасныя прыметнікі, якія не ўтвараюць простай формы вышэйшай ступені параўнання.**

□1) Жывы;
□2) малы;
□3) вішнёвы;
□4) добры;
□5) вялікі.

**А9. Адзначце якасныя прыметнікі, якія ўтвараюць толькі складаную форму найвышэйшай ступені параўнання**.

□1) Прыгожы;
□2) белы;
□3) марозны;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

□4) горшы;
□5) гераічны.

**А10. Адзначце правільнае ўжыванне прыметнікаў.**
□1) Прыгажэйшы горад;
□2) самы прыгожы горад;
□3) цікавейшы раман;
□4) самы цікавы раман;
□5) найстаражытнейшы горад.

**А11. Адзначце формы ацэнкі і меры якасці без параўнання.**
□1) Найбольшы;
□2) драбнюткі;
□3) самы малады;
□4) зелянюсенькі;
□5) найдаражэйшы.

**А12. Адзначце правільнае напісанне прыметнікаў у словазлучэннях.**
□1) Ваніна падарожжа;
□2) цётчыны словы;
□3) бабулевы ўспаміны;
□4) жнівеньскі ранак;
□5) драўлянны дом.

**А13. Адзначце правільнае напісанне складаных прыметнікаў.**
□1) Грашовазрэчавы;
□2) старажытна беларускі;
□3) іншамоўны;
□4) паўночназаходні;
□5) далёкаўсходні.

**А14. Устанавіце адпаведнасць паміж прыметнікам і спосабам яго ўтварэння. Адзначце нумар правільнага адказу.**

| | |
|---|---|
| А. Сугучны | 1) суфіксальны |
| Б. Цёмна-сіні | 2) прыставачны |
| В. Іскрысты | 3) прыставачна-суфіксальны |
| Г. Перадсвітальны | 4) складанне |
| Д. Гаючы | 5) марфалагічна-сінтаксічны |

□А1Б5В3Г4Д2

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

□□□□□□□□

## ПРЫМЕТНІК

Варыянт 2
Тэст А

**А1. Устанавіце адпаведнасць паміж прыметнікам і прыметай, выражанай ім. Адзначце нумар правільнага адказу.**

А. Дзіцячы — 1) прымета паводле месца
Б. Разумны — 2) прымета паводле прыналежнасці
В. Вясковы — 3) прымета паводле прызначэння
Г. Бабуліна — 4) якасць, што ўспрымаецца органамі пачуццяў
Д. Ружовы — 5) унутраная якасць чалавека

□А1Б4В3Г5Д2
□А4Б5В1Г2Д3
□А3Б5В1Г2Д4
□А5Б2В1Г3Д2
□А3Б4В2Г3Д5

**А2. Адзначце субстантываваныя прыметнікі.**

□1) Цытрусавыя;
□2) беларускі;
□3) важатая;
□4) салігорскі;
□5) школьны.

**А3. Адзначце словазлучэнні з якаснымі прыметнікамі.**

□1) Бетонны ліст;
□2) саладзейшы за мёд;
□3) буслава гняздо;
□4) драўляны выраб;
□5) драпежны звер.

**А4. Адзначце словазлучэнні з адноснымі прыметнікамі.**

□1) Хваёвы лес;
□2) багаты ўраджай;
□3) скланяльныя назоўнікі;
□4) цёплае лета;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

□5) Аленчына пісьмо.

**А5. Адзначце словазлучэнні з прыналежнымі прыметнікамі.**

□1) Беларускія краявіды;
□2) леснікоў план;
□3) спелыя суніцы;
□4) Валіна пісьмо;
□5) працоўныя дні.

**А6. Адзначце словазлучэнні з адноснымі прыметнікамі, ужытымі ў значэнні якасных.**

□1) Каменнае сэрца;
□2) учарашні выпадак;
□3) сонечная ўсмешка;
□4) заячая смеласць;
□5) бярозавы сок.

**А7. Устанавіце адпаведнасць паміж прыметнікам у словазлучэнні і яго разрадам. Адзначце нумар правільнага адказу.**

| | |
|---|---|
| А. Бялюсенькі снег | 1) якасны |
| Б. Марылін плашч | 2) адносны |
| В. Лёгкая прамысловасць | 3) прыналежны |
| Г. Бабровы каўнер | 4) адносна-прыналежны |
| Д. Гадавы праект | 5) адносна-якасны |

□А4Б5В1Г3Д2
□А1Б4В5Г2Д3
□А2Б3В4Г1Д5
□А1Б3В5Г4Д2
□А3Б2В4Г5Д1

**А8. Адзначце якасныя прыметнікі, якія не ўтвараюць простай формы вышэйшай ступені параўнання.**

□1) Дарагі;
□2) перадавы;
□3) нізкі;
□4) ліпкі;
□5) зялёны.

**А9. Адзначце якасныя прыметнікі, якія ўтвараюць толькі складаную форму найвышэйшай ступені параўнання.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

□1) Коўкі;
□2) лёгкі;
□3) вузкі;
□4) іскрысты;
□5) звонкі.

**А10. Адзначце правільнае ўжыванне прыметнікаў.**
□1) Найбагацейшая зямля;
□2) багацейшая зямля;
□3) самая багатая зямля;
□4) найноўшы твор;
□5) навейшы твор.

**А11. Адзначце формы ацэнкі і меры якасці без параўнання.**
□1) Велізарны;
□2) найсаладзейшы;
□3) найбольш дасціпны;
□4) менш важны;
□5) даўжэзны.

**А12. Адзначце правільнае напісанне прыметнікаў у словазлучэннях.**
□1) Брылёўскі стыль;
□2) сцюдзённы надвячорак;
□3) новенькі сшытак;
□4) палымянны позірк;
□5) конькі хвост.

**А13. Адзначце правільнае напісанне складаных прыметнікаў.**
□1) Авія-мадэльны;
□2) супрацьлеглы;
□3) шчыра паважаны;
□4) беларускарускі;
□5) светла-зялёны.

**А14. Устанавіце адпаведнасць паміж прыметнікам і спосабам яго ўтварэння. Адзначце нумар правільнага адказу.**

| | |
|---|---|
| А. Дабраякасны | 1) суфіксальны |
| Б. Зімовы | 2) прыставачны |
| В. Пагадзінны | 3) прыставачна-суфіксальны |
| Г. Пажылы | 4) складанне |
| Д. Перадапошні | 5) марфалагічна-сінтаксічны |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ПРЫМЕТНІК

Варыянт 3
Тэст А

**А1. Устанавіце адпаведнасць паміж прыметнікам і прыметай, выражанай ім. Адзначце нумар правільнага адказу.**

| | |
|---|---|
| А. Драўляны | 1) прымета паводле прызначэння |
| Б. Студэнцкі | 2) прымета паводле матэрыялу |
| В. Кіслы | 3) знешняя якасць чалавека |
| Г. Матчына | 4) якасць, што ўспрымаецца органамі пачуццяў |
| Д. Дужы | 5) прымета паводле прыналежнасці |

□А1Б4В3Г5Д2
□А2Б1В4Г5Д3
□А3Б5В1Г2Д4
□А5Б2В1Г3Д2
□А3Б4В2Г3Д5

**А2. Адзначце субстантываваныя прыметнікі.**
□1) Фізіка-матэматычны;
□2) дзесяцібальны;
□3) насякомыя;
□4) трохвугольны;
□5) азімыя.

**А3. Адзначце словазлучэнні з якаснымі прыметнікамі.**
□1) Больш смачны, чым гарбата;
□2) учарашні сход;
□3) карысны дапаможнік;
□4) братаў капялюш;
□5) чытальная зала.

**А4. Адзначце словазлучэнні з адноснымі прыметнікамі.**
□1) Смелы ўчынак;
□2) выдатныя адзнакі;
□3) навучальны год;
□4) Талашова хата;
□5) мучны блін.

**А5. Адзначце словазлучэнні з прыналежнымі прыметнікамі.**
□1) Авечы след;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

□2) касмічны палёт;

□3) асенняя раніца;

□4) квартальны план;

□5) шчупаковая ікра.

**А6. Адзначце словазлучэнні з адноснымі прыметнікамі, ужытымі ў значэнні якасных.**

□1) Жалезная бочка;

□2) лісіная хітрасць;

□3) зямны паклон;

□4) службовы  транспарт;

□5) стальныя нервы.

**А7. Устанавіце адпаведнасць паміж прыметнікам у словазлучэнні і яго разрадам. Адзначце нумар правільнага адказу.**

| | |
|---|---|
| А. Зімовы дзень | 1) якасны |
| Б. Даччын падарунак | 2) адносны |
| В. Чорная металургія | 3) прыналежны |
| Г. Заячая шапка | 4) адносна-прыналежны |
| Д. Здольны вучань | 5) адносна-якасны |

□А4Б5В1Г3Д2

□А1Б4В5Г2Д3

□А2Б3В5Г4Д1

□А1Б3В5Г4Д2

□А3Б2В4Г5Д1

**А8. Адзначце якасныя прыметнікі, якія не ўтвараюць простай формы вышэйшай ступені параўнання.**

□1) Смелы;

□2) цёплы;

□3) сакаўны;

□4) халодны;

□5) шурпаты.

**А9. Адзначце якасныя прыметнікі, якія ўтвараюць толькі складаную форму найвышэйшай ступені параўнання.**

□1) Высокі;

□2) слізкі;

□3) трывалы;

□4) шырокі;

□5) кірпаты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**А10. Адзначце правільнае ўжыванне прыметнікаў.**

□1) Важнейшае пытанне;
□2) найважнейшае пытанне;
□3) самае важнае пытанне;
□4) галасісцейшы певень;
□5) самы галасісты певень.

**А11. Адзначце формы ацэнкі і меры якасці без параўнання.**

□1) Самы ўдалы;
□2) найменш памылковы;
□3) невялічкі;
□4) найбялейшы;
□5) шырачэнны.

**А12. Адзначце правільнае напісанне прыметнікаў у словазлучэннях.**

□1) Сястрына паліто;
□2) восеньскі дождж;
□3) задумены позірк;
□4) Танкаўскія чытанні;
□5) любаньскія мясціны.

**А13. Адзначце правільнае напісанне складаных прыметнікаў.**

□1) Двухпавярховы;
□2) разнакаляровы;
□3) гісторыка-філалагічны;
□4) літаратурна-музычны;
□5) высока-кваліфікаваны.

**А14. Устанавіце адпаведнасць паміж прыметнікам і спосабам яго ўтварэння. Адзначце нумар правільнага адказу.**

| | |
|---|---|
| А. Спелы | 1) суфіксальны |
| Б. Міжрадковы | 2) прыставачны |
| В. Імклівы | 3) прыставачна-суфіксальны |
| Г. Светла-сіні | 4) складанне |
| Д. Звышчалавечы | 5) марфалагічна-сінтаксічны |

□А1Б5В3Г4Д2
□А2Б4В1Г3Д5
□А5Б4В1Г3Д2
□А5Б3В1Г4Д2
□А4Б1В3Г5Д2

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

